# Святочная выстаўка ў бібліятэцы імя Леніна

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна адкрылася вялікая выстаўка, прысвечаная 32-й гадавіне Кастрычніка.

Выстаўка адкрываецца раздзелам літаратуры, якая ілюстроўвае падрыхтоўку і перамогу Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР.

На асобным шчыце — матэрыялы, прысвечаныя тэме «Ленін і Сталін — стваральнікі Беларускай Совецкай дзяржавы». Сярод іх — фотакопіі «Дэкларацыі правоў народаў Расіі», пастановы ВЦВК аб прызнанні незалежнасці Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, дэкларацыі Народнага Схода Заходняй Беларусі.

Шматлікія матэрыялы апавядаюць аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза, партызанскім руху ў Беларусі. Спецыяльныя стэнды прысвечаны перадавым людзям прамысловасці, будаўнікам соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, знатным дзеячам навукі і культуры беларускага народа.

Вялікае месца на выстаўцы адведзена раздзелам, прысвечаным уз'яднанню беларускага народа ў адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве, гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву ў заходніх абласцях БССР.